**І. І. Крук,** *загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУ культуры і мастацтваў*

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА РАЗУМЕННЯ СТРУКТУРЫ ТРАДЫЦЫЙНАГА КАЛЕНДАРА: ТЭОРЫЯ КАЛЯНДАРНЫХ СЕГМЕНТАЎ

У аснове ўсіх адрэзкаў часу, якімі карыстаўся чалавек у сваёй земляробчай і святочна-абрадавай практыцы, ляжалі прыродна-касмічныя цыклы, што ўтваралі Сонца і Месяц. Яны задавалі свой рытм зменлівасці ў стане прыроды і чаргавання гаспадарчых клопатаў, аднак паміж імі было прынцыповае функцыянальнае і структурафарміруючае падабенства, якое факусіравалася ў адных і тых жа фазах: нараджэння, развіцця, дасягнення росквіту, старэння і, нарэшце, немінучай смерці. Сонца паўплывала на ўзнікненне самай фундаментальнай, культурафарміруючай адзінкі вымярэння часу – **года** і адначасова на з’яўленне самай дынамічнай адзінкі, якую назвалі **суткамі**. У межах гэтай часавай сістэмы вымярэння існаваў яшчэ адзін метраном – Месяц, поўны цыкл якога ўтвараў **месяц**, а адна з чатырох яго фаз задавала структуру **тыдня.** У гаспадарчай дзейнасці і міфарытуальнай практыцы гэтыя дзве сістэмы часавага парадкавання цесна ўзаемадзейнічалі па прынцыпе макрасістэмы (сонечны год) і мікрасістэмы Месяца (каляндарны месяц), якая адначасова падпарадкоўвалася макрасістэме і пры гэтым праяўляла пэўную незалежнасць.

У кантэксце сказанага надзвычайную цікавасць уяўляе час правядзення тых ці іншых свят. Калі ўсё больш-менш зразумела з чатырма асноўнымі святамі традыцыйнага календара, якія суадносіліся з ключавымі фазамі ў руху Сонца па небасхіле – у гэтым выразна бачны астракасмічны пачатак, то ўсё астатняе ўяўляецца феноменам духоўнай і працоўнай дзейнасці аднаго соцыуму або вялікай сям’і народаў. Але чаму, напрыклад, святкаванне Грамніц прымеркавана да 15 лютага, а Саракоў – да 22 сакавіка? Якія яшчэ неспазнаныя аспекты старажытнага міфа мы не змаглі расшыфраваць? Якія адценні дыялога чалавека з Сусветам мы пакуль што не спасціглі? Якія абставіны задавалі праграму дзеяння (комплекс рытуальна-абрадавых дзеянняў) чалавека – сям’і – роду – племені? Беларусы, як і астатнія ўсходнеславянскія народы, не захавалі першаснага міфа аб утварэнні свету і аб ролі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вярхоўных багоў у яго парадкаванні, вылучэнні функцый кожнага з іх і адказнасці за аптымальнае існаванне сферы свайго ўплыву. Аднак зразумела, што кожнае архаічнае свята года было ўшанаваннем Бога і пантэона багоў адпаведна іх статусу ў іерархіі і касмічнай паслядоўнасці (нешта накшталт задыякальнага кола або паднябеснага Млечнага Шляху).

Дакладна фіксіраваны падзел гадавога кругазвароту на чатыры роўнавялікія адрэзкі часу (яны чаргаваліся з аднолькавым інтэрвалам), кожны з якіх пачынаўся вялікім святам, ініцыіруе ідэю аб распрацоўцы тэорыі каляндарных сегментаў і вылучэнні іх універсальнай структуры, заканамернасці, паслядоўнасці пераходаў з аднаго сегмента ў другі. Пры гэтым важна высветліць, што з’яўляецца рухомай сілай марфалогіі сегмента і што ўплывае на ўзаемаспалучальнасць яе элементаў. Ідэю чатырох сегментаў не трэба асацыіраваць з той глыбока матэрыялістычнай ідэяй фарміравання календара на падставе працоўнай дзейнасці чалавека і соцыуму. Акрамя таго, яна не з’яўляецца прамым паўторам таго падыходу, які ўжо не адно дзесяцігоддзе пануе ў фалькларыстыцы ў дачыненні да каляндарна-абрадавай паэзіі: падзелу яе на цыклы, якія адпавядаюць порам года, хаця ў народнай свядомасці панаваў двухчасткавы прынцып. У народзе казалі: “Сонца павярнула на лета”, “Сонца павярнула на зіму”. Шырокае франтальнае даследаванне каляндарнай абраднасці, яе светапоглядных асноў, расстаноўкі ідэйных акцэнтаў, зместу абрадавай паэзіі, бясконца вялікай колькасці рэгламентуючых стэрэатыпаў паступова прывяло нас да думкі аб тым, што ў светапогляднай аснове славянскага традыцыйнага календара ляжыць не аморфная структура пораў года з яе неакрэсленымі межамі пачатку і заканчэння, а ідэя акцэнтаванай фіксацыі і дакладнай прымеркаванасці да фаз Сонца. Менавіта фаза Сонца распачынала новы перыяд жыцця чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці і ўплывала на фарміраванне ідэі і праграмнага забеспячэння абрадавай практыкі наступнага каляндарнага сегмента.

У адпаведнасці з вышэйзгаданым атрымліваецца, што ў сонечным гадавым кругазвароце існуюць чатыры самастойныя сегменты, кожны з якіх пачынаецца поўнай стратай бегу часу. Ён быццам спыняецца на 12–14 дзён, замірае. У адзіным і непарушным кругазвароце раптам з’яўляецца своеасблівая “мёртвая кропка” ці, дакладней, “мёртвая зона”, якая факусіруе ў сабе час сцірання ўсіх прымет мінулага. Абрадавая роля аднаго сегмента вычарпана, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

соцыум чакаў ад шамана ці мясцовага валхва (знахара, калдуна, вешчуна) адпаведных кожнаму перыяду сакральных дзеянняў, якія павінны былі рытуальна зафіксаваць пачатак новага перыяду тварэння і тым самым захаваць прыродна-сацыяльную раўнавагу адносін. Вось гэты час і быў пазначаны "адсутнасцю часу", спыненнем дзеяння механізма традыцый папярэдняга сегмента. Каляндарны пераход цалкам паўтараў сітуацыі пераходаў у абрадах сямейна-родавай накіраванасці. Так, адразу пасля заручын дзяўчына набывала пераходны статус нявесты і для таго, каб атрымаць іншы, больш высокі сацыяльны статус, яна павінна была ў прысутнасці і пры поўнай згодзе прадстаўнікоў двух родаў прайсці праз абрадавае пасвячэнне. З аналагічнай сітуацыяй мы сустракаемся падчас смерці чалавека. Пераход са свету жывых у "свет" памерлых магчымы толькі праз выкананне адпаведных абрадавых маніпуляцый з нябожчыкам. Пры гэтым як на вяселлі, так і ў час смерці чалавека абрад мае строга рэгламентаваны характар, які выконваецца дакладна вызначанымі асобамі.

Калі працягваць прапанаваную паралель далей, то мы ўбачым, што для заручын выбіраўся найбольш спрыяльны час, а запуску механізма дзеяння рытуалу заручын папярэднічаў візіт маці жаніха да бацькоў мяркуемай нявесты. Якую ролю ў дадзеным выпадку яна выконвала? Хутчэй за ўсё маці брала (у больш позні час, XVIII – XX стст.) на сябе функцыю, якую ў сівой даўніне выконваў вядун (волхв, знахар, чарадзей). Тую ж самую ролю выконвала бабка-павітуха ў час нараджэння дзіцяці або тры жанчыны-ўдавы ў час абмывання нябожчыка. Аналагічная функцыя ўскладвалася на ўдоў у кантэксце абраду выклікання дажджу і іншых аказіянальных абрадах.

На той факт, што ініцыятарам пераўтварэння хаосу "бясчасся", бязладдзя былі выключна духоўныя асобы, самым непасрэдным чынам указваюць калядныя і валачобныя песні, у якіх звычайны вясковы гаспадар (бог у межах сваёй сям'і, сядзібы, гаспадарчых меж) узвышаўся да статусу нябеснага ўладара, чаму адпавядала сімволіка саноўных асоб. У сувязі з гэтым С.Д. Домнікаў заўважае: "... велічаемы ўзносіцца да верхняга (нябеснага) узроўню, да статусных вярхоў, што артыкулюецца ўказаннем на яго больш высокае, у літаральным сэнсе слова "прыўзнятае" над зямлёй становішча. З рэальнага чалавечага стану велічаемы пераводзіцца ў разрад міфічных герояў свяшчэннай эпохі, якія тварылі на зямлі нябесную рэальнасць. І ва ўпадабленні гаспадароў месяцу, сонцу і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зоркам мы сустракаем нябесную, падобную да царскай сімволіку” [1].

Гэта сімволіка надзвычай шырока прадстаўлена ў валачобных песнях. Напрыклад:

На яго двары чатыры церамы стаяць:
У першым цераму – ясен месяц,
Другі церам – ясна зара,
Трэці церам – ясны звёздачкі,
Чацвёрты церам – буён вецер.
Ясен месяц – сам гаспадар,
Ясна зара – яго жана,
Дробны звёздачкі – яго дачушкі,
Буён вецер – яго сыны [2].

Але хто ў такім разе ўзводзіць гаспадара ў статус міфічнага героя, дэміурга, культурнага першапродка? Кім былі калядоўшчыкі, якія выконвалі абход вёскі? Час “безвременья” – час святкавання Каляд і асабліва іх пачатак – выконваў сярод іншых і семантычную ролю – прадказваў будучыню ўсёй сям’і і яе членаў паасобку. Да нашых дзён захавалася няпісанае правіла: да сустрэчы Новага года вярні ўсе даўгі (г. зн. стабілізуй, ураўнаваж сацыяльную сітуацыю). Лёсавызначальную ролю выконвала першае святочнае застолле, хто першы прынясе вады, хто першы зойдзе ў хату, а самае галоўнае – падчас першай святочнай вячэры ўсе дамачадцы павінны быць у хаце за адным сталом, каб потым на працягу года ўсім заставацца разам. Атрымліваецца ў пэўнай ступені парадаксальная сітуацыя: на працягу самага небяспечнага перыяду (як у астральным, так і сацыякультурным плане) сям’я адгароджвала сябе ад свету Хаосу прасторай упарадкаванасці, Гармоніі – межамі духоўна-культурнай прасторы хаты. Вёска ў гэты час нагадвала Млечны Шлях, у якім кожнае сузор’е знаходзілася ў атамарным становішчы: усе ўстойлівыя сувязі парушаны, кожная планета (сям’я) нагадвала чарапаху, якая схавалася пад сваім панцырам.

І так, як у касмічнай прасторы ролю перша-штуршка, генератара пераўтварэння Хаосу ў гармонію Гусінага Шляху пачынала выконваць Сонца, так і ў свеце жывых павінна была з’явіцца асоба, якая б магла выконваць тую ж самую жыццесцвярджальную ролю. Звычайнаму чалавеку рабіць гэта забаранялася (памятаеце: з хаты не выходзь). Зразумела, што пачатковая ініцыятыва павінна была зыходзіць ад пасрэдніка паміж богам Сонца (Дажджбогам) і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

соцыумам. Гэтую ролю мог выконваць толькі мясцовы чарадзей, а можа той, хто ўлетку на Купалле знайшоў папараць-кветку.

З гэтай тэзы народных светапоглядных уяўленняў і палягае неабвержны пастулат: адвечная традыцыя ёсць закон продкаў, закон, дадзены Богам, і парушаць яго – значыць адрачыся сваіх каранёў і ўгнявіць багоў. Рытуал, або абрад – гэта спецыфічнае сакральна-магічнае дзеянне, якое набліжае чалавека да часу першатварэння свету і якое дадзена яму як літасць Божая, як здольнасць тварыць Гармонію сваімі рукамі, словамі і дзеяннямі. Той, хто ўключаецца ў працэс актуалізацыі рытуалу, знаходзіцца пад абаронай Творцы і сам стварае вакол сябе аўру паразумення на ментальным, а не вербальным узроўні.

Святы традыцыйнага календара беларусаў – гэта даволі складаны комплекс, у якім адначасова задзейнічаны некалькі кодаў або сілавых ліній рэалізацыі ідэі ператварэння Хаосу ў Гармонію. Сярод іх – час правядзення, месца разгортвання падзей, міфалагічныя вытокі, абрадавае дзеянне, якое заўсёды мае сваіх пастаянных спадарожнікаў – слова, атрыбут, ежу, песню, танец; абрадавае адзенне, дзеючыя асобы і г.д. Абрад можа дасягнуць мэты, прадугледжанай традыцыяй, толькі тады, калі ў гэтым “аркестры” кожны інструмент будзе весці сваю лінію- мелодыю, але пры гэтым усе яны будуць аб’яднаны адной тэмай гучання.

І ўсё ж гэтага недастаткова, каб пераканаўча сцвярджаць, што ўзгаданая паліфанія і ёсць само Боскае тварэнне. У кожным абрадзе існуюць яшчэ і такія складовыя, пра якія ніхто не казаў услых, але кожны ўдзельнік ведаў і разумеў, што яны ёсць і “працуюць”. Напрыклад, сістэма варажбы, прадказанняў, магія ўплывовасці і падкантрольнасці; нябачная, але абавязковая прысутнасць душ даўно памерлых продкаў. А над усім гэтым верхаводзіла крэатыўная энергетыка калектыўнай мыслядзейнасці (мысляформ).

Такім чынам, паспрабуем падвесці прамежкавыя вынікі нашым разважанням адносна стратэгіі народнага календара і сутнасці каляндарных абрадаў у кантэксце тэорыі сегментаў. У пазіцыі судакранання двух каляндарных сегментаў узнікаюць фазавы разрыў часу і адпаведна разрыў ў існаванні традыцыі. Ідэалагічны рэсурс аднаго сегмента вычарпаны, наступае перыяд перакадзіроўкі. У сваю чаргу ён мае складаную структуру. Спачатку наступае час “безвременья”, затым дзякуючы калектыўным намаганням аморфнасць часавага памежжа пачынае афармляцца ў выглядзе даўняй традыцыі, якая схавана ў глыбінях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектыўнага несвядомага і якая актуалізуецца як духоўна-магічны першаштуршок, а гэта і ёсць рытуал, накіраванасць якога мае даволі жорсткую прадвызначальнасць. Адступаць ад яе проста немагчыма, таму што кантралюючай інстанцыяй у дадзеным выпадку будуць продкі.

Выкананне адвечнага абраду – гэта зямная іпастась таго, што некалі здзяйснялася на нябёсах. Чалавек тварыў "по образу и подобию" сваіх старажытных багоў, па таму непарушнаму сцэнарыю, які шмат стагоддзяў таму прыдумалі продкі. Чалавек не меў права парушыць боскае благаславенне і адступіцца ад шляху, некалі абранага продкамі.

Застаецца не зусім зразумелым толькі адзін аспект у тэорыі сегментаў: чаму раптам адладжаная хада часу спыняецца і ўтвараецца міжфазавы разрыў, працягласць якога застаецца аднолькавым ва ўсіх чатырох фазах сонечнага кругазвароту? Звернемся да абрадаў сямейна-родавай накіраванасці. Ад нараджэння дзіцяці і да таго часу, пакуль яно атрымае родавае імя, павінен прайсці пэўны час – дзевяць або нават сорак дзён. Заручаная дзяўчына таксама аказвалася ў фазе "безвременья" – яна не мела права прымаць удзел ні ў якіх абрадах, таму што дзявочы статус яна ўжо страціла, а жаночы яшчэ не набыла. Гэты пераходны перыяд мог доўжыцца ад двух да чатырох тыдняў. Тое ж самае адбывалася і пасля смерці чалавека. На тры дні жыццё замірала не толькі ў сям'і памерлага, але і ва ўсёй вёсцы. Лічылася кепскай прыметай, калі падчас вяселля нехта паміраў.

У кожным выпадку мы сутыкаемся з адным і тым жа алгарытмам статуснай пераходнасці. Чалавек страчваў адзін статус існавання і праз абавязковае выкананне адпаведнага рытуалу набываў іншы. Тое ж самае было характэрна і для пластыкі паэтычнай трансфармацыі таго ці іншага перыяду традыцыйнага календара.

Скразная культурная дамінанта, якая пранізвала і аб'ядноўвала святы, прымеркаваныя да пачатку кожнага сегмента, зводзілася да ідэі касмічнага і чалавечага ўсеадзінства. Вектараў рэалізацыі ўзаемапранікнення і ўзаемаўзбагачэння было некалькі. Кожны з іх адпавядаў універсальнай сістэме кода: лічбаваму, каляроваму, раслiннаму, жывёльнаму, падзейна-абрадаваму, арнаментальнаму, персанажнаму, атрыбутыўнаму, рытуальных страў.

Безумоўнай дамінантай рытуальна-абрадавага комплексу была непадзельная суаднесенасць часу прымеркавання і прасторы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканання. Вызначальнай рысай часу была дыскрэтнасць = адсутнасць часу (“безвременье”) = бязладдзе. Існаванне дзвюх плоскасцей часу, калі на адной разгортваецца пачатак веснавога цыкла з выразнай дамінантай разгортвання прыроднага стану, а на другой час раптоўна спыняецца і распачынаецца супрацьлеглы працэс яго згортвання, вельмі выразна прадстаўлена ў галашэннях.

Ідэя разарванасці часу і неабходнасці ў сувязі з гэтым захаваць устойлівасць сферы чалавечага пражывання запатрабавала, каб асноўнай складовай сегментаўтваральных свят сталі абрадавыя дзеянні, скіраваныя на ўзвядзенне кола. Менавіта таму асноўным абрадавым кампанентам усіх каляндарных святкаванняў былі абходы вёскі, якія ўзводзілі кола, замыкалі жыццёвую прастору пражывання вясковага соцыуму.

Абходы вёскі, ваджэнне карагодаў, распальванне кастроў, прыгатаванне адпаведных абрадавых страў, выкарыстанне вялікай колькасці рэчаў-атрыбутаў – усё гэта стварала атмасферу свята, у якім зліваліся сферы касмічнага, прыроднага і сацыяльнага жыцця. Усё ўкручвалася ў адзін суцэльны карагод, перапляталася, пераўвасаблялася, дапаўняла адно другое. Гэты час нагадваў сабой нейкія сусветныя жорны, у якіх узгадаванае зерне (даўняя традыцыя) трапляла ў прастору паміж сіламі Нябёсаў і ўладарамі Зямлі, трансфармавалася, ператваралася ў муку (вось ён час пераходу, бясформеннасці, аморфнасці, сусветнага хаосу). Але да жорнаў падыходзіў Бог, Творца, чарадзей, знахар, браў муку ў рукі і распачынаў працэс аднаўлення традыцыі. У гэтым працэсе выразна бачыліся зачаткі новага жыцця. Так, як семя трапляла ў чэрава жанчыны (сімволіка Сусветнага акіяна, над якім некалі панавала цемра) і ў сасудзе-ўлонні пачынала набываць выразныя рысы новае жыццё, так і перамолатае зерне змешвалася ў гліняным посудзе, расчынялася-заквашвалася, расло, а потым з дапамогай таго ж самага Сонца – агню, якое некалі дало жыццё зерню, афармлялася ў выглядзе хлеба, кашы, бліноў, караваяў, якія самым актыўным чынам уключаліся ў кантэкст абрадаў, стабілізуючы–адраджаючы аднаўленую традыцыю.

Калі ўважліва прыгледзецца да язычніцкіх абрадаў, то стане зразумелым, што іх абавязковымі кампанентамі з’яўляюцца сімвалічныя рытуальныя стравы, якія і ўвасаблялі пераход – перанараджэнне і аднаўленне – адраджэнне. Сярод іх былі: а) стравы з цэльнага зерня (куцця на Каляды – пры нараджэнні Сонца), бабіна каша пры нараджэнні дзіцяці), б) стравы з перамолатага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зерня – хлеб-соль, каравай – на ўлазінах або вяселлі; в) эмбрыянальныя прадукты – яйкі на Вялікдзень, Радаўніцу, Сёмуху, на жніво; яечня – на Сямік і на Купалле. Яны былі свайго роду “носьбітамі пачатку росту, энергіі прыхаванага ў іх жыцця і развіцця. Абавязковымі для свята былі абрады выпякання свежага хлеба: замешванне цеста, яго далейшае павелічэнне – сімвалы тварэння – нараджэння Свету (або новага яго этапа). Урадлівасць, якая разумеецца праз апладненне, рытуальна аднаўляецца абрадамі пагружэння сонца (колас, кветка, полымя і г.д.) у зямлю (ваду), якія сустракаюцца ў кожным з асноўных свят.

Калі абрады пераходу (фіксуючыя пачаткі новага этапа тварэння або новы сегмент у структуры календара) запаўнялі перыяд “безвременья”, аднаўляючы кругабег часу, запускалі складаны механізм жыццёвай і працоўнай дзейнасці, то што адбывалася далей у межах распачатага сегмента? Якраз гэта пытанне і патрабуе далейшага карпатлівага даследавання. Адказ на яго дапаможа прыадкрыць тайны міжфазавых каляндарных сегментаў.

---

1. *Домников, С.Д.* Мать-земля и Царь-град. Россия как традиционное общество / С.Д.Домников. – М.: Алетейа, 2002. – С. 201.
2. *Паэзія* беларускага земляробчага календара / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А.С.Ліса. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – С. 126.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ